*Юлія Чарнавокая*

# АРМЕЙСКІ АЛЬБОМ ЯК ФОРМА СУЧАСНАГА ПІСЬМОВАГА ФАЛЬКЛОРУ

Альбомная славеснасць – адна з асноўных форм сучаснага пісьмовага фальклору, – яшчэ не дастаткова вывучана айчыннымі фалькларыстамі. Як магчымы прадмет для апісання і антрапалагічнай рэфлексіі неафіцыйныя традыцыі салдацкіх груп пачалі ўспрымацца параўнальна нядаўна. З сярэдзіны 1990-х гадоў гэты слой сучаснай субкультуры ўстойліва прыцягвае ўвагу фалькларыстаў, у прыватнасці расійскіх [1, *186*].

Вывучаючы пісьмовы фальклор салдат тэрміновай службы, мы павінны адрозніваць дэмбельскі альбом і армейскі блакнот, бо яны маюць розную прыроду. Калі армейскі блакнот служыць «акумулятарам» салдацкай традыцыі, то асноўнае прызначэнне альбома – «памяць пра службу» [2, *613*].

Структуру сучаснага салдацкага альбома нельга назваць строга вызначанай. Ёсць альбомы, якія абмяжоўваюцца афармленнем «рамкі» з выкарыстаннем спецыфічных тэкстаў зачына і фінала. Аднак у некаторых выпадках, разам з адзначанай «рамкай» структуруецца і ўнутраная прастора альбома: тэксты групуюцца па жанрах, вылучаюцца рубрыкі. Як і альбом, салдацкі блакнот звычайна адкрываецца тэкстам – зачынам напрыклад (тут і далей у прыкладах захоўваецца пунктуацыя і арфаграфія арыгінала) [*1]:

*Открой блокнот мой друг или подруга*
*И проведи глазами по строкам*
*Написан он в часы досуга*
*И грусти по родным местам*
*Но если ты мужского пола*
*И этих мук не испытал*
*Закрой блокнот не мни бумагу*
*Не для тебя его писал!* [**3]

Паводле шматлікіх тэкстаў, асноўнае прызначэнне армейскай службы, яе важнасць заключаецца ў цяжкасцях, якія неабходна пераадолець салдату. Акрамя таго, што такія творы выконваюць ініцыіруючую функцыю, яны дазваляюць лепш асэнсаваць пазаармейскія каштоўнасці [1, *217*]. У сувязі з гэтым характэрны вершаваныя творы, якія нярэдка змяшчаюць у сабе зварот, накіраваны «на гражданку». Гэта можа быць зварот да сябра:

*Ты помнишь друг как мы гуляли*
*Вино, девчонки, кабаки*
*А в место этого нам дали*
*Х/Б, портянки, сапоги* [**2]

бацькоў:

*Отец и мать, вы ждите сына,*
*Дай бог здоровья вам на век,*

*Для офицера я скотина,*
*Ну а для вас я – человек* [**2]

альбо каханай:

*Гуляй девчонка, спи спокойно*
*Ведь гдето стиснув автомат*
*Тебя сегодня охраняет*
*Твой бывший друг, теперь салдат* [**1]

Нягоды ваеннай службы ўзмацняюць жаданне салдата хутчэй наблізіць час дэмабілізацыі. Адпаведна вяртанне «на гражданку» ўспрымаецца як бясконцае свята:

*Ты верь солдат, взойдёт она,*
*Звезда пленительного счатья*
*Мы крикнем «Дембель» и тогда*
*Заплачут девушки от счастья.*
*Казармы рухнут и у входа*
*Нас встретит радостно свобода*
*И на обломках КПП*
*Напишем буквы:*
*ДМБ* [*1].

Пашыраным жанрам салдацкага фальклору з’яўляюцца парадыйныя вершы, сярод якіх нярэдка сустракаюцца так званыя «салдацкія малітвы» – адмысловыя пераробкі традыцыйных замоў, напрыклад:

МОЛИТВА СОЛДАТА

*Спаси господи от вечных тревог,*
*От подъёма раннего*
*От крика дневального*
*От овса, от перловки*
*От строевой подготовки*
*От занятий физических*
*От работ принудительных*
*От турника высокого*
*От марш броска далёкого*
*От губы временной*
*От бабы беременной*
*От информаций разных*
*От баб проказных*
*АМИНЬ* [**3].

Ні адзін салдацкі альбом не абходзіцца без рыфмаваных пажаданняў і подпісаў да фотаздымкаў. Цікава адзначыць, што гэтыя тэксты супадаюць з тымі, якія мы можам сустрэць у альбомах школьніц і на старонках сшыткаў маладых злачынцаў:

*Пишу тебе 4 строчки*
*Целую в обе щёчки*
*Прошу незабывать*
*Любить и вспоминать* [**1].

Ці:

*На долгую-долгую память,*
*А может на несколько дней*
*Это зависит от дружбы,*
*От дружбы твоей и моей!* [**1]

Важнае месца ў альбомах і блакнотах займае армейская афарыстыка, накіраваная на карэкцыю светапогляду салдат, на ідэнтыфікацыю лірычнага героя адпаведных твораў як члена армейскага калектыву. Яна ўстанаўлівае адносіны паміж тымі, «кто был», і тымі, «кто не был», як паміж «посвящёнными» і «непосвящёнными»:

1. *Армия без мата*
*как солдат без автомата* [**2].

2. *Кто был студентом,*
*Видел юность,*
*Кто был солдатом,*
*Видел жизнь*[**2].

3. *Если б девушки служили,*
*Мы б на дембель не спешили!* [**3]

Ацэначная накіраванасць тэкстаў, якія малююць армейскае жыццё, адрозніваецца парадаксальнасцю: клішэ, якія прадстаўляюць армейскую службу як «ганаровы абавязак» і якія акцэнтуюць вялікую асобасную значнасць салдацкай місіі, могуць як поўнасцю прымацца, так і поўнасцю адхіляцца [2, *615*]. Выразным прыкладам сказанаму могуць быць наступныя тэксты з рознай, нават палярнай, ацэнкай армейскай службы:

*1. Лишь тот достоен уваженья*
*Кто службу в армии познал*
*Кто долю юности счастливой*
*В дали от дома потерял* [**3].

*2. Когда-то пил я и гулял,*
*Но вот хреновый день настал*
*Теперь в суботу вместо пьянки*
*Я на ноги кручу портянки* [**2].

Разнастайныя расшыфроўкі ў блакнотах і альбомах салдат, па нашым назіранні, закранаюць у асноўным абрэвіятуры назваў родаў войск і армейскую тэрміналогію, напрыклад:

***Г** – гостеприимное*
***У** – убежище*
***Б** – бастующих*
***А** – армейцев* [**1].

Нярэдка ў салдацкіх блакнотах сустракаюцца і так званыя «толковые словари» тыпу:

*1. Каптёрка – остров сокровищ.*

*2. В бане – в мире животных.*
*3. Дневальный – деревья умирают стоя.*
*4. Утренний осмотр – следствие ведут знатоки.*
*5. Казарма после отбоя – в гостях у сказки* [**1].

Што да армейскага песеннага рэпертуару, то ён вызначаецца вялікай разнастайнасцю. Адзначым толькі тое, што, на наш погляд, у ім дамінуюць «пeратэкстоўкі» вядомых песень:

*С чего начинается служба?*
*С рассказа сержанта в купе,*
*Со старой и маленькой станции*
*С железных ворот КПП.*
*А может она начинается…* [**2].

Трэба адзначыць, што тэксты, якія ўваходзяць у армейскі альбом, характарызуюцца высокай ступенню паўтаральнасці. Разам з тым, сярод складальнікаў сустракаюцца і арыгіналы, у блакнотах якіх пераважаюць цытаты з мастацкай літаратуры, філасофскіх сачыненняў альбо тэксты папулярных ці любімых песень, напрыклад:

*Расплескалась синева, расплескалась*
*По тельняшкам растеклась по беретам,*
*Даже в сердце синева затерялась*
*Разлилась своим заманчивым цветом…* [**3].

Па назіраннях даследчыкаў, вядзенне блакнота альбо выраб альбома з’яўляецца абавязкам для кожнага салдата. Гэта ідэнтыфікуе салдат як членаў адпаведнага калектыву. Пагардлівае стаўленне да гэтай традыцыі ўспрымаюцца як выклік звычаям, якія склаліся ў армейскім асяроддзі, і магчымае толькі як адлюстраванне свядомага пратэсту супраць дыктату гэтых звычаяў, якія справядліва асацыіруюцца з «духам арміі» [2, *616*]. Армейскі блакнот, сапраўды, ствараецца «на память», аб чым нярэдка ідзе гаворка ў яго тэкстах. Ён таксама служыць своеасаблівай хрэстаматыяй – сховішчам для тэкстаў, якія потым будуць выкарыстаны для стварэння дэмбельскага альбома.

Такім чынам, альбомная культура ўзнікае, функцыянуе і развіваецца ў адносна замкнутых сацыяльных субкультурах, у прыватнасці салдацкай. У салдацкіх блакнотах і альбомах пераважаюць наступныя тыпы твораў:

- у выпадкова зменeным выглядзе (памылкі пры спісванні альбо завучванні напамяць, замена адных слоў іншымі пры захаванні аўтарскай канцэпцыі тэксту ў цэлым);
- у пераапрацаваным выглядзе (свядомы адбор асобнага фрагмента тэксту, замена адрасата і інш., але з захаваннем тэматыкі і літаратурнай «сур’ёзнасці»);
- у парадыйна-зніжаным выглядзе (пародыі-перапрацоўкі, літаратурныя рэмінісцэнцыі ў самадзейных тэкстах) [2, *617*].

Пры гэтым выпадкова зменeныя тэксты адаптуюцца да запатрабаванняў альбома (альбо да складальніка альбома), разам з тым змяняецца іх прагматычная функцыя. Верш набывае новае жыццё, далёкае ад

кантэксту творчасці яго аўтара. Страта аўтара і змяненне функцыі тэксту, як вядома, ствараюць умовы для фалькларызацыі літаратурнага твора. Асаблівую цікавасць уяўляюць сабой лірычныя творы, занатаваныя ў салдацкіх альбомах, якія, магчыма, зніжаюць эмацыянальны дыскамфорт маладых людзей, адарваных ад родных і блізкіх. Відавочна, што асноўнай функцыяй альбома з’яўляецца мадэляванне іншай рэальнасці, нейкага ідэальнага свету, дзе лёгка можна знайсці адказы на пытанні, прадпісанні, як сябе паводзіць у той ці іншай сітуацыі, адпаведна ацаніць яе.

## ЗАЎВАГА

*1. У артыкуле выкарыстаны ўласна сабраныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў рэгіянальным архіве вучэбнай фальклорна-краязнаўчай лабараторыі пры кафедры беларускай літаратуры БрДУ УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна».

## ІНФАРМАНТЫ

**1. Запісана ў в. Амелянец Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Вольфа Валерыя Мікалаевіча, 1980 г. н., мясцовы.

**2. Запісана ў в. Дубраўцы Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Дземідзюка Дзмітрыя Дзмітрыевіча, 1986 г. н., мясцовы.

**3. Запісана ў г. Высокае Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Усава Артура Сяргеевіча, 1986 г. н., мясцовы.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Головина, В. В.* Субкультура солдат срочной службы / В. В. Головина, М. Л. Лурье, Е. В. Кулешов // Современный городской фольклор / ред. С. Ю. Неклюдов. – Москва, 2003.

2. *Калашникова, М. В.* Современная альбомная традиция / М. В. Калашникова // Современный городской фольклор / ред. С. Ю. Неклюдов. – Москва, 2003.